УДК 94(476)"1980"+323.396(476)(091)

# НАМЕНКЛАТУРНЫЯ ЭЛІТЫ І НОВЫЯ ВЫКЛІКІ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА КАНЦА 1980-х гг.*

*А.Маркава*
*Карлаў Універсітэт, Praha, U Kříže 8, Praha 6 Jinonice, 158 00, Česká republika, alena.markova@fhs.cuni.cz*

Дадзены артыкул прысвячаецца рэакцыі Камуністычнай партыі Беларусі (КПБ) і яе наменклатурных эліт на новыя выклікі беларускага грамадства канца 1980-х гг., звязаныя з узнікненнем і развіццём новага нацыянальнага руху. У артыкуле будзе прааналізавана стаўленне камуністычнай партыі да новых "нефармальных" рухаў і фармаванняў, якія аказвалі значны ўплыў на тагачаснае грамадства. Адначасова будуць разгледжаны шляхі і стратэгіі ўзаемадзеяння кампартыі з прадстаўнікамі дадзеных арганізацый. У артыкуле будзе таксама закранацца пытанне пашыранага выкарыстання беларускай мовы ў сістэме асветы і адукацыі, якое належала да прыярытэтных накірункаў дзейнасці КПБ у канцы 1980-х гг.

***Ключавыя словы**: Камуністычная партыя Беларусі; двухмоўе; "нефармальные" арганізацыі; 1980-я гг.*

# НОМЕНКЛАТУРНЫЕ ЭЛИТЫ И НОВЫЕ ВЫЗОВЫ БЕЛОРУССКОГО ОБЩЕСТВА КОНЦА 1980-х гг.

*А.Маркова*
*Карлов Университет, Praha, U Kříže 8, Praha 6 Jinonice, 158 00, Česká republika, alena.markova@fhs.cuni.cz*

Данная статья будет посвящена реакции Коммунистической партии Беларуси (КПБ) и ее номенклатурных элит на новые вызовы беларуского общества конца 1980-х гг., связанные с возникновением и развитием нового национального движения. В статье будет рассматриваться отношение коммунистической партии к новым «неформальным» структурам и организациям, оказывающим значительное влияние на общество данного периода. Одновременно в статье будут рассматриваться пути и стратегии взаимодействия компартии с представителями данных организаций. В статье будут также затронуты вопросы расширенного использования беларуского языка в системе народного образования, относящиеся к приоритетным направлениям деятельности коммунистической партии в конце 1980-х гг.

**Ключевые слова:** *Коммунистическая партия Беларуси; двуязычие; "неформальные" организации; 1980-е гг.*

# OLD NOMENCLATURE ELITES AND NEW CHANGES AND CHALLENGES OF BELARUSIAN SOCIETY OF THE LATE 1980s *

*A.Marková*
*Charles University,*
*Prague, U Kříže 8, Praha 6 Jinonice, 158 00, Czech Republic, alena.markova@fhs.cuni.cz*

This paper will focus on the reaction of the Communist Party of Belarus (KPB) and its nomenclature elites to new political and social changes and challenges in Belarusian society, and in particular to the emergence of a new wave of national emancipation at the end of 1980s. The paper will analyze the Communist Party's attitude and the strategies it applied to the new "informal" structures, parties, and organizations, which had a considerable impact on the Belarusian society of that period. In addition, the paper will analyze the Communist Party's attempts to promote the national (Belarusian) language in the educational system of the late 1980s.

**Key words:** *Communist Party of Belarus; national language; "informal" organizations of 1980s; national emancipation; 1980s.*

Напрыканцы 1980-х гг. Камуністычная партыя Беларусі (КПБ) сутыкнулася з шэрагам новых выклікаў, якія прыносіла паступовая лібералізацыя грамадства і развіццё нацыянальнага руху ў БССР пасля перабудовы. Сярод такіх выклікаў быў,

* This publication was supported by the Czech Science Foundation (GA ČR) – GAČR 18-18108S, Neo-Belarusization Processes in Post-Soviet Belarus in the National Independence Era (1990-1995) – Charles University, Faculty of Humanities, 2019.

напрыклад, сур’езны ідэалагічны крызіс, які вёў да масавага выхаду камуністаў з шэрагаў камуністычнай партыі. Адначасова ён суправаджаўся ростам колькасці і ўплыву так званых “нефармальных” арганізацый, якія часта прапанавалі грамадству адказы на хвалюючыя надзённыя пытанні, якія тычыліся экалагічнай сітуацыі вакол Чарнобыля ці шляхоў выхаду з эканамічнага, палітычнага ці сацыяльнага крызісаў. “Нефармальныя” рухі і арганізацыі, якія першапачаткова заяўлялі сябе непалітычнымі, але неўзабаве хутка палітызаваліся, прапаноўвалі таксама новую нацыянальную ідэю і дэманстравалі грамадству новае стаўленне да нацыянальнай гісторыі, спадчыны, пытанняў мовы і ідэнтычнасці.

Камуністычная партыя вымушана рэагавала на новыя патрабаванні грамадства і дзейнасць “нефармальных” арганізацый, каб ісці ў нагу з часам і нават па магчымасці перахапіць ініцыятыву ў некаторых надзённых пытаннях. Адным з такіх крокаў была спроба ўкаранення пашыранага выкарыстання беларускай мовы ў публічнай прасторы ў канцы 1980-х гг., якая адбылася яшчэ да прыняцця ключавога па сваей сутнасці “Закона БССР аб мовах у Беларускай ССР” на 14-й сесіі Вярхоўнага Савета БССР адзінаццатага склікання 26 студзеня 1990 г. Менавіта гэтаму пытанню, а таксама шляхам і стратэгіям узаемадзеяння с “нефармальнымі” элітамі будзе прысвечана галоўная ўвага ў дадзеным артыкуле. Пры гэтым увага засяродзіцца на т.зв. нізавыя узроўні старых наменклатурных эліт (мясцовыя ячэйкі КПБ), якія самым непасрэдным чынам сутыкаліся з новымі рэаліямі і патрабаваннямі, а таксама вырашалі бягучыя задачы. У якасці асноўнага масіва дакументаў будуць прааналізаваныя дакументы па дзейнасці пярвічных партячэек Міністэрства адукацыі БССР, перадусім пратаколы рэгулярных адкрытых і закрытых партыйных сходаў, якія праходзілі да самага роспуска кампартыі 25 жніўня 1991 г. Такая ўвага абумоўлена тым, што менавіта перад Міністэрствам адукацыі ў канцы 80-х – пачатку 90-х гг. непасрэдна паўсталі высунутыя партыяй патрабаванні больш інтэнсіўнагга выкарыстання беларускай мовы ў сістэме асветы і адукацыі. Апроч таго згаданыя дакументы даюць мачымасць пазнаёміцца са стратэгіяй узаемадзеяння партыі з новымі “нефармальнымі” элітамі, а таксама часткова даюць ацэнку іх дзейнасці.

Адным з імпульсаў для разгортвання дзейнасці па прасоўванню беларускай мовы быў X Пленум ЦК КПБ 13 мая 1988г. У дакладзе першага сакратара ЦК кампартыі Беларусі Я.Я.Сакалова прагучала неабходнасць прасоўвання двухмоўя і павышэння ўзроўня выкладання беларускай мовы ў агульным кантэксце павышэння культуры міжнацыянальных зносін і паважлівага стаўлення да гістарычнай і культурнай спадчыны свайго народа [1, с. 16–17]. Таму ў «Асноўных мерапрыемствах па далейшаму развіццю народнай адукацыі ў Беларускай ССР», якія былі прынятыя на X пленуме, прадугледжвалася не толькі пашырэнне выкладання гісторыі БССР у школах ці выданне новых падручнікаў, але таксама і падрыхтоўка большай колькасці настаўнікаў беларускай мовы, павелічэнне гадзін яе выкладання ў ВНУ і г.д. [2, с. 88]. Акрамя таго, пры ажыццяўленні мерапрыемстваў зыходзілася з пастановы калеіі Міністэрства адукацыі БССР №21 ад 23 лістапада 1988 г. «Аб дадатковых мерах па рэалізацыі прынцыпа двухмоўя ў навучальных установах рэспублікі» [3, арк. 13].

У той жа час важным патрабаваннем, якое «накладвалася» на прасоўванне беларускай мовы, была г.зв. дэмакратызацыя навучання, якая часта прадугледжвала падтрымку ўласнай ініцыятывы педагагічных устаноў і іх дэцэнтралізацыю.

Амаль адразу пасля пленума на партсходах ужо афіцыйна даводзілася, што «справа аднаўлення ў сваіх правах беларускай мовы і літаратуры, з той прычыны, што змяніць псіхалогію насельніцтва, і ў першую чаргу, сённяшніх бацькоў, прадстаўляецца не вельмі простай, як здаецца некаторым беларускім пісьменнікам, а тым больш студэнтам-філолагам» [4, арк. 36]. Тым не менш, на кожным партсходзе канстатавалася актыўная дзейнасць па прасоўванню двухмоўя, якая заключалася ў пашырэнні карыстання беларускай мовай у педвучылішчах, пераводзе справаводства Міністэрства адукацыі на беларускую мову, павялічэнню колькасці кабінетаў беларускай мовы і літаратуры і г.д. Прапанавалася таксама пашырыць наглядную агітацыю на беларускай мове, у прасоўванні якой Міністэрства значна адставала [5, арк. 41].

Ужо ў кастрычніку 1989г. адбылося падагульненне вынікаў згаданых мерапрыемстваў. Пры гэтым праца па іх ажыццяўленню абрунтоўвалася «выпраўленнем памылак мінулага, якія прывялі к рэзкаму звужэнню сферы выкарыстання гэтых [нацыянальных – *А.М.*] моў і аслабленню ведання іх парадусім моладдзю» [6, арк. 72].

Паводле дадзеных Міністэрства, колькасць беларускамоўных дзіцячых садоў, якая ў 1984/85 вуч. г. складала толькі 1,1% (усяго 49) па рэспубліцы, к 1 студзеню 1989г. складала ўжо 19% (993 садка), акрамя таго 8% (412) садкоў працавалі на абодвух (рускай і беларускай) мовах. У кастрычніку таго ж года гэтыя лічбы яшчэ павялічыліся – 1761 садкоў працавала на беларускай мове, а беларуска-рускіх групаў было ўжо 2653 (усяго ж у рэспубліцы налічвалася 5249 садкоў). Для забяспячэння бесперапыннасці навучання беларускамоўныя садкі адчыняліся пры беларускіх школах [7, арк. 73–74].

Акрамя таго, у дашкольныя выхаваўчыя праграмы ўводзіўся беларускі фальклёр і элементы беларускага выяўленчага мастацтва, выдаваліся зборнікі беларускіх музычных твораў, хрэстаматыі па беларускай літаратуры і слайды па беларускаму мастацтву і г.д. Прадугледжваліся курсы на беларускай мове для выхавальнікаў і кіраўнікоў дзіцячых садкоў, а таксама рыхтаваўся шэраг тэматычных перадач на тэлебачанні [8, арк. 74].

У пачатковых класах сярэдніх школ была выраўнена колькасць гадзін выкладання беларускай і рускай моў, у рускіх школах уводзілася выкладанне беларускай мовы з першага класа (адна гадзіна вуснага курса), а падрыхтоўчыя тэксты к гэтым заняткам публікаваліся ў “Народнай асвеце”. Акрамя таго прадугледжвалася выданне новых падручнікаў па беларускай мове і літаратуры г.д. [9, арк. 75–76].

Натуральна, што гэтая праца праходзіла з цяжкасцямі, якія звычайна заключаліся ў недахопе настаўнікаў беларускай мовы (напр., Віцебская вобласць у канцы 1989 г. была забяспечана толькі 50% настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры), недахопе навуковых распрацовак па выкладанню мовы ва ўмовах існуючага білінгвізму і г.д. Акрамя таго, такія выдавецтвы, як “Народная асвета”, выдавалі неабходную літаратуру вельмі марудна, а “іншыя выдавецтвы “Полымя”, “Беларусь” і ўвогуле не хацелі дапамагаць” [10, арк. 76].

Вялікую цяжкасць выклікала выданне дапаможнікаў па гісторыі беларускай літаратуры, асабліва па перыяду 20-30-х гадоў. Прычына палягала ў недахопе спецыялістаў і аўтарскіх калектываў, якія б узяліся за распрацоўку гэтага яшчэ нядаўна непапулярнага перыяда даследвання беларускай гісторыі [11, арк. 76].

У самім міністэрстве з наступнага 1990 года прадугледжвалася “актыўна прыцягваць камуністаў і работнікаў аддзелаў да перавода справаводства Міністэрства і яго падведамасных устаноў на беларускую мову”, а таксама “актыўна ўплываць на паспяховае авалодванне беларускай мовай усімі працоўнікамі апарата Міністэрства адукацыі з мэтай яе актыўнага выкарыстання ў службовай дзейнасці” [12, арк. 71]. У рамках інстытуцыяналізацыі гэтай дзейнасці планавалася нават стварыць пярвічную партаранізацыю “Таварыства беларускай мовы” [13, арк. 71].

Тым не менш, на партсходах адзначалася, што “дзейнасць па ажыццяўленню перахода на двухмоўе яшчэ не суадносіцца са становішчам беларускай мовы ў рэспубліцы” [15, арк. 76].

Як вынікае з пратаколаў, на гэтых жа партсходах не пакідаліся без увагі і іншыя злабадзённыя аспекты дзейнасці камуністычнай партыі, а менавіта стаўленне да новых нацыянальных рухаў (галоўным чынам, маладзевых “нефармальных” рухаў і фармаванняў), якія набіралі моц і ўсе больш уплывалі на грамадства, чым не маглі на той момант пахваліцца прадстаўнікі КПБ.

Гэтае пытанне набывала яшчэ большую вастрыню, таму што, як адзначалі некаторыя прадстаўнікі “старой” наменклатуры, адбывалася паступная палітызацыя маладзёвых фармаванняў, якія першапачаткова заўлялі сябе як арганізацыі па ахове культурнай спадчыны і г.д. Акрамя таго, большасць членаў згаданых арганізацый і г.зв. “нефармалаў” складалася з бывалых камсамольцаў [15, арк. 2].

Часта прадстаўнікі кампартыі падкрэслівалі “самадзейнасць” “нефармальных” аранізацый і іх “аматарскі характар” [16, арк. 13–14 і інш.]. Па іх меркаванню, гэтыя суполкі “ідэалізавалі буржуазную мадэль грамадства”, прасоўвалі ідэі “рэгіянальнай замкнёнасці” і нацыяналізма [17, арк. 8]. Аднак нават і ў гэтых выпадках прадстаўнікі старой наменклатуры ўсё ж прызнавалі “ўнёсак самадзейных аб’яднанняў у прабуджэнне нацыянальнай самасвядомасці, у прыцягненне ўвагі да становішча беларускай мовы і культуры, да праблемаў аховы навакольнага асяроддзя, гістарычных і культурных помнікаў, і да гістарычнага мінулага беларускага народа” [18, арк. 9].

Кіруючыя работнікі Мінадукацыі неаднойчы заяўлялі, што нягледзячы на сваё веданне беларускай мовы, яны не здольныя весці дыскуссію з “нефармаламі”. У той самы час тагачасны міністр адукацыі БССР М.І.Дзямчук у лютым 1989г. адзначаў, што пасіўная пазіцыя ў дачыненні да “нефармалаў” недапушчальная, і “калі будзем

абараняцца, то можна прайграць. Зараз неабходна перахапіць ініцыятыву, уцягваць нефармалаў у дыскусію. У нас зараз няма канцэпцый па многім накірункам, але мы іх напрацоўваем”. На думку міністра, палеміка мела засяродзіцца перадусім на пытаннях мовы і экалогіі [19, арк. 5].

Меркавалася таксама вывучыць дзейнасць і праграмы моладзевых “нефармальных” арганізацый, каб у далейшым нейтралізоўваць “нездаровыя” тэндэнцыі і “аказваць партыйную падтрымку і практычную дапамогу ў рэалізацыі праграм тых аб’яднянняў, якія цвёрда стаяць на сацыялістычных пазіцыях” [20, арк. 15].

Акрамя гэтага, звычайным і праверaным спосабам лічылася забеспячэнне работнікаў міністэрства, у тым ліку прапагандыстаў і настаўнікаў, новай прапагандысцкай літаратурай, якая б дапамагала адказваць на надзённыя пытанні ў палеміцы з “нефармаламі”. Новыя дапаможнікі па ідэалагічнай рабоце таксама планавалася друкаваць на беларускай мове [21, арк. 7].

Праверaным метадам нейтралізацыі ўплыву “нефармальных” суполак было, па меркаванню прадстаўнікоў старых наменклатурных эліт, узмацненне мэтавай агітацыі праз лектараў таварыства “Веды” і сістэму палітвучобы [22, арк. 4, 6]. Гэтыя лекцыя і дыскусіі павінны былі дапамагчы выпрацаваць “правільнае” стаўленне слухачоў да праграмных патрабаванняў “нефармальных” арганізацый. Адначасова партыйная вучоба камуністычных кадраў праз метадалаічныя і тэарэтычныя семінары мела “выпрацаваць стойкі імунітэт да розных буржуазных канцэпцый” [23, арк. 57].

Акрамя таго заахвочвалася і падтрымлівалася стварэнне ўласнай альтэрнатывы “аматарскім” аб’яднанням, якімі павінны былі стаць “палітычня клубы моладзі па актуальных пытаннях гісторыі, культуры і мовы беларускага народа” [24, арк. 16]. У гэтую дыскусію пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі планавалася прыцягваць прафесійных гісторыкаў, экспертаў, выкладчыкаў і іншых спецыялістаў.

У заключэнні можна адзначыць, што камуністычная партыя не адкідвала дыскуссію з “нефармаламі” па актуальных моўных і іншых пытаннях як непатрэбную ці нявартую ўвагі. КПБ таксама рэальна ацэньвала патэнцыйны ўплыў прадстаўнікоў гэтых арганізацый, хоць і часта лічыла іх праграмныя выступленні непадрыхтаванымі ці “аматарскімі”. Кампартыя старалася не толькі ўліцца ў дыскусію, але і перахапіць у ей ініцыятыву, выкарыстоўваючы ўсе даступныя ёй сродкі. Акрамя таго, адным з накірункаў дзейнасці кампартыі напрыканцы 1980-х гадоў стала дзейнасць па прасоўванню беларускай мовы ў сістэме навукі і адукацыі, якая прадугледжвала павялічэнне колькасці гадзін выкладання беларускай мовы ў школах і ВНУ, адкрыццё дзіцячых садкоў з беларускай мовай выхавання і іншыя мерапрыемствы.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**


1. Материалы X пленума Центрального Комитета Компартии Белоруссии, 13 мая 1988 г. Минск : Беларусь, 1989.
2. Там жа.
3. Нац. арх. Рэсп. Беларусь (далее НАРБ). Ф. 498. Воп. 2. Спр. 3. Арк. 13.
4. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 1. Арк. 36.
5. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 3. Арк. 41.
6. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 4. Арк. 72.
7. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 4. Арк. 73-74.
8. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 4. Арк. 74.
9. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 4. Арк. 75-76.
10. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 4. Арк. 76.
11. Там жа.
12. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 4. Арк. 71.
13. Там жа.
14. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 4. Арк. 76.
15. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 3. Арк. 2.
16. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 3. Арк. 13-14.
17. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 3. Арк. 8.
18. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 3. Арк. 9.
19. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 3. Арк. 5.
20. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Сп р. 3. Арк. 15.
21. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 3. Арк. 7.
22. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 3. Арк. 4, 6.
23. НАРБ. Ф. 498. Воп. 2. Спр. 3. Арк. 16.
24. НАРБ. Ф. 1353. Воп. 2. Спр. 2026. Арк. 57.